Нет, экономические дела, за которые прежде всего отвечает премьер, не могли резко увеличить претензии к нему за последние дни — скорее наоборот. И мы неизбежно возвращаемся к трагедии в Буденновске. Черномырдин дал полномочия на переговоры ненавистному нашим «ястребам» Сергею Ковалеву. Черномырдин в прямых переговорах с Басаевым подтвердил соглашение, достигнутое группой Ковалева. Черномырдин, судя по всему, помешал новым преступным попыткам штурма больницы, при которых атакующие бойцы должны были бы неизбежно пробиваться с огнем через тысячную толпу заложников.

«Это голосование за войну», — сказал в связи с этим вашему корреспонденту Егор Гайдар. Очевидно, такое голосование заслуживает того, чтобы в преддверии выборов избиратели знали подробности.

По данным независимой информационно-аналитической группы, из фракции коммунистов голосовали за недоверие правительству 45 депутатов, или 96 процентов общей численности фракции, но при этом за отставку силовых министров — лишь двое (остальные по большей части не участвовали в этом голосовании, что в данном случае равносильно голосованию против). А сколько проклятий обрушила КПРФ на головы силовых министров за разгром октябрьского мятежа 1993-го! Когда, как не сейчас, можно было расквитаться с ними! Но, видно, политическое родство сторонников войны пересилило политическую конкуренцию разных фракций этого лагеря.

Из депутатов Аграрной партии за недоверие правительству — 88 процентов, за отставку силовых министров — 0.

Из жириновцев за недоверие правительству — 45 человек, или 83 процента, за отставку силовых министров — 1 депутат (какое трогательное единение с коммунистами!). Из отколовшейся от жириновцев «Державы»: 100 процентов за недоверие правительству, 0 — за отставку «силовиков».

Из бабуринского «Российского пути» за недоверие правительству — 90 процентов, за отставку силовых министров — 0.

Из Демократической партии Сергея Глазьева, которой и принадлежала инициатива самого голосования, за недоверие правительству — 100 процентов, за отставку силовых министров — 20 процентов.

В день выборов не забудьте, уважаемые избиратели, кто проголосовал за партию войны!

Увы, гораздо меньше было фракций, показавших ярко выраженное обратное соотношение.

«Женщины России»: 10 процентов — за недоверие правительству, 86 процентов — за отставку силовых министров.

«Выбор России»: 6 процентов — за недоверие правительству, 61 процент — за отставку силовых министров.

ПРЕС: 5 процентов — за недоверие правительству, 36 процентов — за отставку силовых министров.

«Яблоко» и «Союз 12 декабря» (группа Бориса Федорова) практически в равной степени проголосовали и против правительства в целом, и против трех министров. Из созданной правительством группы «Россия» 10 депутатов, или более четверти, проголосовали... за недоверие правительству. А из поддерживающей якобы черномырдинский избирательный блок фракции «Новая региональная политика» за недоверие правительству высказались 62 процента (при 25 процентах — за отставку силовых министров).

Президент не согласился с вотумом недоверия правительству — иное решение противоречило бы логике всей предшествующей политики Бориса Ельцина. Если Дума вновь примет вотум недоверия, то президент должен будет либо отправить правительство в отставку, либо распустить Думу. Вероятно, на этом основании инициатор голосования о недоверии Сергей Глазьев 21 июня говорил с трибуны о необходимом для такого голосования мужестве. Между тем еще несколько месяцев назад, выразив явное недовольство антиинфляционными устремлениями в проекте бюджета на 1995 год, Дума не решилась проголосовать против бюджета и тем самым — за недоверие правительству. Остановила ее угроза ответного роспуска Думы президентом. Что же они сейчас так расхрабрились? Ответ очевиден — достаточно взглянуть на календарь. Теперь уже роспуск Думы не грозит депутатам реальной потерей кресел на сколько-нибудь заметный срок, поскольку все равно выборы на носу. Похвалиться «мужеством» перед избирателями можно без всякого риска.

Голосованием 21 июня думская оппозиция впервые открыто продемонстрировала поддержку силовым министрам НА ДЕЛЕ при имитации непримиримости на словах. Тем самым президент, также поддерживавший до сих пор силовых министров при всех их конфликтах с демократической общественностью, оказался через эту троицу неожиданно близок к атакующей его оппозиции. Опасная близость: в глазах демократически настроенных избирателей она президента компрометирует, а в глазах непримиримой оппозиции все равно не оправдает. Сумеет президент на сей раз дистанцироваться от этих министров? Или прав Твардовский — пушки к бою едут задом?..

Отто ЛАЦИС.
«ИЗВЕСТИЯ», № 114.

ЭКАНОМІКА

ЦІ АТРЫМАЕ БЕЛАРУСЬ КРЭДЫТ?

У жніўні міжнародны валютны фонд будзе вырашаць пытанне аб выдзяленні Беларусі другой траншы крэдыту STAND-BY.

Як паведаміў прэм'ер-міністр Міхаіл Чыгір на прэс-канферэнцыі, перамовы з місіяй МВФ прайшлі з узаемным разуменнем пазіцый абодвух бакоў. Падпісаны мемарандум, які прадугледжвае даволі жорсткія палажэнні і лічбы. Найбольш цяжка выконваемае для Беларусі патрабаванне МВФ — павышэнне тарыфаў на камунальныя паслугі: не менш чым на 60 працэнтаў з III квартала бягучага года і не менш чым на 80 працэнтаў са студзеня будучага года.

Пасля вяртання Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з Санкт-Пецярбурга гэтае пытанне будзе з ім абмяркоўвацца. У Кабінеце Міністраў распрацоўваецца механізм павышэння тарыфаў з адначасовай кампенсацыяй па асобных групах насельніцтва з найменшымі даходамі. Калі рашэнне аб павышэнні тарыфаў будзе прынята, то іншых перашкод, па словах прэм'ера, не будзе, і ў жніўні МВФ зможа прыняць рашэнне аб выдзяленні нам другой траншы крэдыту stand-by.

Гэты крэдыт, сказаў прэм'ер-міністр, патрэбны нам не столькі для падтрымкі эканомікі, хаця яна і знаходзіцца ў цяжкім становішчы, колькі для пагашэння запазычанасці па крэдытах заходніх краін на агульную суму 160 мільёнаў долараў. Міжнародны імідж рэспублікі ўраду не абыякавы, і перамовы з МВФ будуць працягвацца.

Уладзімір ТРАЦЦЯКОЎ.

МЕДЫЦЫНА

ІДЭІ, ЯК І ОРГАНЫ, ТРАНСПЛАНТУЮЦЦА. АЛЕ ВЕЛЬМІ ПАВОЛЬНА

Каб атрымаць міжнароднае прызнанне, Беларускаму цэнтру трансплантацыі касцявога мозгу спатрэбілася менш чым два гады. Каб пераканаць уладных людзей адмяніць падатковы прэсінг адносна «продажу» яго унікальных тэхналогій для хворых блізкага замежжа, здаецца, прыйдзецца патраціць часу разоў у дзесяць больш. Атрымаўшы гарантыі Лонданскага і Гановерскага універсітэтаў, беларускі цэнтр стаў членам Асацыяцыі еўрапейскіх цэнтраў трансплантацыі касцявога мозгу. Але і ў статусе еўрапейскага ён не можа зарабіць для Беларусі ні цэнта.

Перш чым каменціраваць гэтыя падзеі, кіраўнік цэнтра і намеснік галоўнага ўрача 9-й клінікі, на базе якой і адкрыта гэта унікальная медустанова, Анатоль Ус расказвае, што ж яна ўяўляе сабой сёння.

Цэнтр, тэмпамі будаўніцтва, абсталяваннем, стэрыльнасцю якога захапляліся і спецыялісты, і журналісты ў кастрычніку 93-га, сёння стаў вялікай гаспадаркай. У ім чатыры аддзяленні: уласна трансплантацыі, рэанімацыі, гематалогіі, дзённы стацыянар. Плюс інфраструктура, плюс радыелагічны корпус, што вось-вось будзе ўведзены ў строй. Каманда цэнтра, якая атрымала дзякуючы ўраду, Міністэрству аховы здароўя і замежным калегам магчымасць стажыравацца ў тым жа Гановеры, пралячыла за гэты час каля дзвюх тысяч чалавек, 26-ці паспяхова зроблены унікальныя аперацыі па перасадцы касцявога мозгу. Але калі ў першыя месяцы разлічваць на дапамогу ў безнадзейных выпадках маглі толькі дарослыя хворыя на рак крыві, то цяпер спектр дзеяння спецыялістаў цэнтра значна расшырыўся.

«Сумесна з дзіцячымі гематолагамі мы стварылі брыгаду па трансплантацыі касцявога мозгу хворым дзецям, — расказвае Анатоль Леанідавіч. — Цяпер нашымі пацыентамі сталі не толькі гематалагічныя, але і анкалагічныя хворыя — пры лімфагранулёматозах, лімфасаркоме, множнай міэломе».

Прыкладна ў верасні пачнём укараняць методыку, па якой працуюць медыкі толькі высокаразвітых краін. Я маю на ўвазе трансплантацыю перыферычных ствaловых клетак пры метастазах раку малочнай залозы, гэта значыць, радыкальнае вырашэнне праблемы. Як былы, так і цяперашні міністры аховы здароўя нас усяляк падтрымліваюць і ў асваенні новых тэхналогій, і ў клопатах аб лякарствах і прадметах догляду нашых хворых.

У дні адкрыцця цэнтра паведамлялася аб тым, што на тры гады ўсім неабходным мы забяспечаны нямецкім Чырвоным Крыжам праз пасрэдніцтва беларускага. Цяпер, калі запасаў засталося крыху больш чым на год, трэба думаць аб будучыні. Вядома, Чырвоны Крыж Беларусі зноў гатовы стаць пасрэднікам у перагаворах з міжнароднымі дабрачыннымі арганізацыямі. Спадзяёмся, што падключацца ўрад і МЗС. Але нейкую частку сродкаў мы маглі б зарабіць самі, калі б наша дзейнасць па лячэнню хворых з-за мяжы не прыраўноўвалася да камерцыйнай і, адпаведна, не абкладалася б велізарным падаткам. Размова ідзе вось аб чым: беларускія хворыя лечацца ў нас бясплатна, і так будзе да таго часу, пакуль жыццё грамадзяніна ў нашай айчыне не дасягне належнага ўзроўню. Але сёння ў нас ёсць і еўрапейская якасць, і месцы, і магчымасці аказваць дапамогу, скажам, грамадзянам з блізкага замежжа, гэта значыць былога Саюза. Вядома, за плату, але намнога ніжэйшую, чым на Захадзе, дзе такія аперацыі па трансплантацыі каштуюць да 200 тысяч долараў. Аднак пры сённяшнім падаткаабкладанні дзве трэці заробленага прыйдзецца аддаць дзяржаве. Мы падлічылі, што не толькі на ўласнае развіццё не заробім у такой сітуацыі, а нават затраты пакрыем усяго на 50 працэнтаў.

Увогуле, праблема ўсёй айчыннай аховы здароўя выразна акрэсліваецца на прыкладзе нашага цэнтра: маючы унікальныя тэхналогіі і спецыялістаў еўрапейскага ўзроўню, мы не можам зарабляць на сваё развіццё і казну пры гэтым папаўняць. Калі ў бліжэйшы час заканадаўцы не зменяць што-небудзь у сістэме падаткаабкладання медустаноў такога тыпу, то хадзьба па замкнутаму кругу — справа, як вядома, безнадзейная — будзе працягвацца.

Лідзія ПЕРАСЫПКІНА,
БЕЛІНФАРМ.

ФОТОРЕПОРТАЖ

ЮНЫХ СПОРТСМЕНОВ ПРОВОЖАЛИ В АМЕРИКУ

На днях в американский город Нью-Хевен вылетела группа юных белорусских спортсменов. Они примут участие во Всемирных специальных олимпийских играх, которые проводит движение «Спешал олимпик». Подобные олимпийские игры очень популярны среди детей во всем мире. Они дают возможность молодым людям соревноваться по различным видам спорта со своими сверстниками из других стран.

По этому поводу в Республиканском Дворце пионеров и школьников состоялись проводы юных спортсменов.

Фото Максима ЕГОРОВА.

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

ПАД'ЕЗД

Міхась ПАРАХНЕВІЧ.

У гэтым горадзе, што белакаменнымі паверхамі шырока разлёгся па абодва бакі Бярэзіны, я стала быў «прапісаны» гадоў з пятнаццаць таму: тут жыве матчына сястра, надзвычай гасцінная, сардэчная і па-вясковаму шчырая жанчына, хоць са сваёй роднай глускай вёскі збегла сюды недзе пасля самай вайны ў бумазейнай рудой сукенцы ды ў галёшах з паношаных бурак. Каб галёшы хоць як трымаліся на нагах, неаперанае дзяўчо панапіхала ў іх мяккай кудзелі. А на галаву павязала новую зялёную хусцінку ў чырвоныя зорачкі. За такі дарагі набытак тры дні не разгіналася над балотнымі купінамі, прынесла ў вясковую краму ажно шэсць вёдраў буйных, як вішні, перадзімовых журавін — тады за кілаграм нарыхтоўшчыкі плацілі дваццаць капеек...

Калі ехала ў далёкі незнаёмы горад у кузаве спадарожнай палутаркі, маладое цела саграваля салдацкая ватоўка, што засталася ад нябожчыка-бацькі, ды некім пасланы ахапак аўсянай саломы, якая пахла даўнім летам, палявым пылам і мышамі.

У тыя, не такія ўжо даўнія, часіны ўсе мы самі дасканала прайшлі навуку пляскаць у далоні з выпадку розных маскоўскіх падзей, радаваліся, што першымі ў свеце паспяхова пабудавалі краіну «развітога сацыялізму», а я, далей схаваўшыся ад ідэалагічнай эйфарыі, праводзіў свой чарговы водпуск у цёткі, ад золку да палудня праседжваў з вудамі ў прырэчных хмызняках... Адтуль вяртаўся заўжды з неблагім уловам. Цётка жыла ў аднапакаёвай «хрушчоўцы» на пятым паверсе пяціпавярховага блочнага дома. Штодзень у сваю дваццатую кватэру я збягаў-уздымаўся па некалькі разоў на дзень міма іншых дзвярэй, пляцовак, міма жыльцоў роднага цётчынага пад'езда... Праз месяц, добра такі нарыбачыўшыся, вяртаўся ў Мінск.

Цяпер цётка, хоць яшчэ даволі і маладжавая, «рассыпалася»: занямоглі ногі, пры кожным кроку моцны боль у сэрцы. Адным словам, згарэла на працы, бо, як па тым часе гаварылі палітінфарматары, яна трыццаць гадоў нястомна і самаахвяддана прастаяла шліфоўшчыцай каля станка ды дзесяць — кладаўшчыцай у інструменталцы, дзе ўсё на нагах, на нагах, ні на хвіліну не прысесці. Вось і даслала цётка адчайнае пісьмо: хутчэй прыязджай, мой любы пляменнічак, ты мой адзіны палец на руцэ, мая надзея і апора...

А што мне, інваліду-пенсіянеру? Сабраўся ды і паехаў. Дзве-тры гадзіны — вось я і ў знаёмым пад'ездзе. Не, я зусім не той чалавек, што ныранўў у пад'езд з начной дажджавой цемры, каб пацiскацца ўслодыч з нейкай там Любкай ці Манькай, пасмактаць з рыльца «чарніл», пакурыць ды зноў «гуляць у зажымоніху». Для такіх людзей любы пад'езд — глыбокая тайна за пяццю пячацямі. Цётчын пад'езд для мяне — люстэрка чалавечага жыцця. Вось зараз, уздымаючыся на пяты, тыцкаю пальцам у дзверы, быццам так я здароўкаюся з жыльцом, што там, за таямніча-маўклівым дэрмацінам, можа, падсумоўвае рэшты «зуброў» ды мядзведзяў пасля вяртання з крамы, гатуе не бог якую адмысловую вячэру альбо горача даказвае некаму, з чаго трэба пачынаць прэзідэнту, каб пенсіянеры хадзілі ў краму з кошыкамі, а не з авоськамі... О, як у нас кожны ўмее даваць парады!

Пятнаццаць год таму... А што цяпер? І міжволі «перакінуліся мосцікі» паміж мінулым і сённяшнім.

ЗЯМНАЯ СЦЮАРДЭСА

Тады яна мяне заўсёды сустракала на ганку — гэтая звонкагалосая, з вялікімі сінімі вачыма дзяўчынка. Яе акуратна запленая каса тоўстым гарапнікам ляжала на грудзях, і гадавалая, вельмі ўжо стракатая кошка з пушыстым хвастом так і тузала кіпцюрыстымі, у рыжыя палоскі, лапамі за шырокі чорны бант. Я раней яшчэ на рацэ адкладваў у асобны мяшэчак драбязу: верхаводак, ёршыкаў, печкуроў, каб тут жа, каля ганка, аддаць Танінай Мурцы. Кошка, паблісквaючы яркімі зялёнымі вачыма, прагна накідвалася на рачны ласунак, злосна мармытала на бывалых катоў, што, аблізваючыся, вылазілі з-пад ганка, з-за бэзавых кустоў. Я адганяў прэч няпрошаных гасцей, а Таня тлумачыла мне як маленькаму:

-- Маю Мурку ніводзін кот не пакрыўдзіць.

-- Чаму ж так?

-- Чаму? А таму, што яна — кошка...

Для мяне, прызнацца, гэта было навіной. Як жа я дасюль не ведаў пра такія вось каціныя адносіны?

Таня жыла па-суседску — у дзевятнаццатай кватэры. Яе бацькі былі настаўнікі: бацька выкладаў матэматыку, маці — біялогію. Калі я проста так, дзеля пустой цікаўнасці, пытаўся ў Тані, кім яна хоча быць, трэцякласніца вельмі выразна вымаўляла:

-- Сцюардэсай.

-- А настаўніцай? Як твае бацька і маці... А прадаўшчыцай марожанага, цукерак, піражных? — я ласкава тузаў Таню за цяжкую касу.

-- Не, сцюардэсай, — стаяла на сваім дзяўчынка.

-- Ну, а на самалёце ты хоць раз лятала?

-- Лятала. З Мінска ў Сочы і назад...

І вось далёка ззаду засталіся пятнаццаць гадоў. Адразу ж пасля прыезду да цёткі заўважыў: у ваннай трэба прымацаваць палічку з люстэркам, а без патрэбнага інструмента не абысціся. Пазваніў суседзям. На мой званок выйшаў малады дзяцюк год трыццаці і на галаву вышэйшы за мяне. Я сказаў, што мне трэба, на што незнаёмы ласкава адказаў:

-- Я мігам параблю дзіркі.

Ён увішна і трапна біў малатком па свярдзёлку, і я ўвесь час хваляваўся, каб ён, крый Бог, не стукнуў па пальцах. Аднак гэтага не здарылася. Сусед прымацаваў мне палічку. Падзякаваўшы, я прапанаваў суседу «замачыць нашу справу». Сусед усміхнуўся, адказаў, што нявapта, што зараз ён адпраўляецца ў таксапарк, каб выехаць на чарговае дзяжурства.

Калі сусед, развітаўшыся, выйшаў з кватэры, я спытаў у цёткі:

-- Гэта, мусіць, як яе... Танін муж? Відаць, вельмі добры чалавек.

-- Але, Танін, — хітра ўсміхнулася цётка. — Гэта мо ўжо пяты ці дзесяты. Мяняе іх што пальчаткі тыя.

-- А маці, бацька як на ўсё гэта глядзяць? Яны як-ніяк, а настаўнікі.

-- Бацька пайшоў да другой, мусіць, не вытрымаў, а маці вочы на ўсё заплюшчыла. Адно і ведае: сабаку на прагулку вадзіць ды з катамі гуляць...

Калі прыходзіў з рыбалкі, то часта заставаў каля пад'езда «Волгу» з шашачкамі над кабінай. Потым аднойчы на гэтым месцы спынілася «Таёта», і з яе ў чорнай скуранай куртцы і аб'ёмістым дыпламатам выйшаў сярэдніх гадоў дзяцюк, прайшоў на другі бок машыны і расчыніў дзверцы. З машыны важна выкацілася маладжавая жанчына з густа нафарбаваным тварам. Модны джынсавы касцюм абцягваў яе зграбную фігуру. Яны ўздымаліся першымі, я ў сваёй рыбацкай робе, знарок адстаючы, чэпаў услед. Пстрыкнуў замок, двое зніклі за дзвярыма дзевятнаццатай кватэры. Цяпер я цвёрда пераканаўся: гэта была яна, Таня, са сваім чарговым палюбоўнікам...

Потым я ці то з балкона, ці то каля ганка бачыў Таню: яна вылазіла з «Рэно», а можа, з «Мерседэса» ці яшчэ з якой машыны невядомай мне фірмы, але ніколі я не бачыў, каб яна вярталася дамоў пехам.

-- А дзе ж наша суседка Таня працуе? — аднойчы спытаў я ў цёткі, ставячы каля яе ложка поўную міску юшкі з фунтавікоў-ліноў, якіх навывуджваў на прырэчным возеры.

-- То от, бачыш, і працуе, — горка ўсміхнулася цётка. — Вучоба нешта ёй не пайшла. Здаецца, восем класаў скончыла ды і закінула, за іншае ўзялася...

-- Некалі, памятаю, Таня хацела сцюардэсай быць, на самалётах лятаць, — наразаючы хлеб, заўважыў я.

Цётка сербанула поўную лыжку, цмокнула губамі, быццам не пачуўшы майго пытання:

-- Ой жа якая, пляменнічак, смачная твая юшка! Сало-одкая! Паху-у-чая!.. А навошта гэтай Тані тая сцюардэса. У яе і на зямлі добрых лётчыкаў хапае. Нідзе не працуе, а жыве — дай Бог кожнаму...

Ах, Таня, Танечка, зямная сцюардэса!

Працяг у наступным нумары.

ПРА РОДНЫХ

Ганна ЕРАШОВА.

МОЙ ЛЮБЫ БАЦЬКА

Як толькі збіраюся ехаць на радзіму ў вёску Вялікая Вуса, што на Уздзеншчыне, перад вачыма адразу паўстае крышку прыгорбленая постаць бацькі, які, пачуўшы гул машыны, спяшаецца да акенца, адвешвае занавескі і пільна ўглядаецца...

Зараз бацька ўжо немалады. Яму — 70. Мала гэта ці многа? Гледзячы на яго жвавасць і шчырую ўсмешку — няшмат, а калі перавярнуць у памяці ўсё пражытае --дык і занадта. Хопіць не на адну кнігу.

Нарадзіўся ў галодным 25-ым. Помніць гады калектывізацыі. А яшчэ, як яны, дзеці (а іх у бацькоў было пяцёра), недаядалі, хадзілі ў залатаных кашулях і лапцях, з самага маленства шмат працавалі. І марылі... Марылі пра лепшую будучыню. Верылі, што яна, гэта светлая будучыня, не за гарамі, што хутка-хутка ўсё зменіцца да лепшага. Але грымнула вайна і ўраз перакрэсліла ўсе мары і спадзяванні. На фронт пайшлі два старэйшыя браты, а ён, меньшанькі, застаўся з бацькамі дома. І невядома, як бы склаўся лёс далей, каб не тая жнівеньская раніца 1942 года.

Да школы, што стаяла на ўзгорку, пасярод вёскі, сагналі ўсіх жыхароў. Людзі ведалі, што іх чакае. І ведалі, за што: за сувязь з партызанамі.

Можна зараз толькі паспрабаваць уявіць, што адчувалі тыя бабулі і дзядулі, маці, якія трымалі за рукі або на руках сваіх маленькіх дзетак. Людзі плакалі, развітваліся і маліліся, прасілі Божай дапамогі, каб захаваць жыццё хаця б іх дзеткам. І ці то быў проста выпадак, ці то Усявышні пачуў просьбу людскую, але нечакана прыехаў начальнік раённай паліцыі і сказаў, што расстрэльваць нікога не будуць, усім даруюць жыццё, але ўсе жыхары павінны ехаць працаваць на «вялікую Германію».

Збіраліся хутка. Не паспелі апамятацца, як прыехалі на падводах паліцаі. Шлях быў нескладаны. Праз лес — да станцыі Негарэлае. Яшчэ не звярнулі ў лес, як вялізныя чорныя клубы дыму агарнулі родныя палеткі — вёска гарэла.

Падвода, на якой ехаў бацька з роднымі, была апошняй. Кіраваў ёю паліцай-украінец: па гаворцы было зразумела. Калі схаваліся ў лесе, ён сказаў бацьку: «Невядома, ці прыйдзецца вярнуцца вам дадому, калі хочаш, малы, уцякай». Думаць не было часу, і бацька, у чым сядзеў, саскочыў з воза і кінуўся наўцёкі.

Да вёскі падышоў, калі сцямнела. Але на месцы хат было адно папялішча. На сэрцы — жах, смутак і жаданне адпомсціць. Пераначаваў на могілках і падаўся да стрыечнага брата, які жыў у мястэчку Узда. А потым, у свае юначыя семнаццаць — дабравольцам на фронт.

Усё было: адступленні, акружэнні, прарывы, абарона, наступленні. Раненне пад Беластокам, шпіталь і зноў — фронт. Перамогу сустрэў пад Берлінам. Мае шмат узнагарод.

Пасля Перамогі вярталіся ў родныя мясціны франтавікі. Пашанцавала і высланым у Германію аднавяскоўцам — выжылі, хоць вяртацца і не было куды. Жылі ў зямлянках, па некалькі сем'яў разам. Але ж выстаялі, дзякуй Богу. Паціху вёска адбудавалася.

Увесь час бацька шмат працаваў. Спачатку ў родным калгасе, а потым, да выхаду на пенсію, сталярнічаў у Уздзенскай ПМК-3. Працаваў усюды добрасумленна. Мае шмат узнагарод за працоўныя поспехі. Майстрам на ўсе рукі называюць яго аднавяскоўцы. І сапраўды, ён выдатны сталяр, плотнік, пячнік. Колькі сябе памятаю, да нас заўсёды ехалі і ішлі людзі: хто за дапамогай, а хто — проста параіцца. І бацькавы ўмелыя рукі і шчырае сэрца дапамагалі ўсім чым маглі. Колькі ім пабудавана хат-прыгажунь, колькі змайстравана вокнаў, дзвярэй! Яшчэ не адно пакаленне гаспадынь нашай вёскі (і не толькі) будзе добрым словам успамінаць бацьку, узяўшы ў рукі апалонік, дзежачку ці маслабойку, выкананыя ім па-майстэрску, з душой.

Пражыта нялёгкае жыццё. Але і сёння, у такі складаны для ўсіх час, — ні хвіліны без справы. Дапамагае чым можа людзям, а для нас, дзяцей, унукаў, ён — галоўны дарадчык і памочнік. А яшчэ — ён у нас вялікі аптыміст. Верыць у тое, што ўсё зменіцца ў лепшы бок, але толькі тады, калі кожны з нас будзе шмат і добрасумленна працаваць.

Бягуць гады. Бягуць, забіраючы з сабой паціху маладосць, спрыт, здароўе. Усё часцей па начах трывожаць раненні... І ўспаміны. Апошнім часам, часцей, чым звычайна, заўважаю бацьку за такім заняткам: ціха, каб ніхто не перашкаджаў, садзіцца на канапу, бярэ старыя сямейныя фотакарткі і падоўгу разглядае іх. Пільна ўглядаецца ў твары сваіх двух братоў, якія так і не вярнуліся з фронту, сястры з чатырма пляменнікамі, якіх разам з іншымі жыхарамі вёскі Літавец за сувязь з партызанамі спалілі фашысты, бацькоў. Божа, якім жа трэба быць чалавекам, каб гэтулькі перажыўшы, зберагчы цяпло і ласку, любоў і павагу да жыцця, да людзей! Як хочацца, каб такіх людзей, як мой бацька, Лясун Уладзімір Апанасавіч, было сярод нас болей! Каб яшчэ доўга-доўга свяціліся вокны бацькоўскай хаты.

...Ад'язджаем назад, у горад. Ужо і з вёскі выедзем, а ў вачах зноў жа — бацькава постаць, яго шчырая ўсмешка і добрыя вочы. І яшчэ ў нас жаданне, каб доўга-доўга ён быў з намі...

Гэтым лістом Ганны Ерашовай мы пачынаем друкаваць допісы чытачоў аб блізкіх і родных людзях. Бадай, у кожнага чалавека ў жыцці ёсць хтосьці, да каго заўжды цягне, каго заўсёды памятаеш і адчуваеш непахісную любоў.

Мы чакаем вашых лістоў пра тых, хто напаўняе наша жыццё глыбокім сэнсам.

«ДВ» ПРЕДСТАВЛЯЕТ

ФИЛЬМЫ О ВЕЛИКОЙ ПОБЕДЕ

С интересом и волнением смотрится в эти дни художественная киноповесть «Дочь командира», поставленная режиссером Борисом Горошко на киностудии «Беларусьфильм» по сценарию Юрия Яковлева.

Валентина вспоминает свое детство. Школьница из Бреста, она собиралась в Артек, когда началась война... А потом были героическая оборона Брестской крепости, поиск воды для раненых и снарядов для единственной уцелевшей пушки. Валя, дочь командира, ее маленькие друзья Гриня и Дима бесстрашно помогали защитникам крепости.

В главных ролях снимались Аня Назарьева, Валентина Ананьина, Владимир Талашко.

В программу тематического показа включены также художественные киноленты «Хлеб поровну», «Факт», «Я вас дождусь», «Битва за Москву», «Взорванный ад», «Доктор Вера», «Ждите связного», «Ленинградцы — дети мои».

«ВРЕМЯ ВАШЕЙ ЖИЗНИ»

Картина создана совместно кинематографистами России и «Беларусьфильма». Ее постановку осуществил режиссер Олег Фомин.

Замечательный американский писатель Уильям Сароян не так известен и популярен в нашей стране, как его современники Хемингуэй, Стейнбек, Фолкнер. В его проникнутых добрым юмором романах и драмах действуют наивные и эксцентричные герои, часто попадающие в трагические ситуации. Именно такими людьми населена экранизированная пьеса писателя: это и неудавшийся боксер верзила Том, и бедная проститутка Китти, видящая себя в собственных грезах знаменитой поп-звездой, и потерявший работу танцор и мим Гарри, и такой же безработный тапер Уэсли.

Действие происходит в 1939 году в провинциальном американском городке в помещении небольшого ресторана.

Главные роли исполняют Олег Фомин, Ольга Жулина, Никита Высоцкий, Сергей Никоненко, Анатолий Равикович.

«ОХОТА ЗА «ЗОЛОТЫМ СКОРПИОНОМ»

Производство США. Автор сценария — Ольга Ихар. Режиссер — Умберто Ленси.

Вначале считалось, что история о существовании древней индейской реликвии — Золотого Скорпиона — это миф. Но, как выяснилось позже, Скорпион в действительности существует и запрятан далеко в непролазных джунглях. Только одному человеку известно точное местонахождение сокровища. Этот человек — отважный исследователь, который немало лет провел среди индейцев. Находятся люди, которые преследуя цель завладения Скорпионом, похищают ученого...

«КОСМИЧЕСКИЙ КРЕСТОВЫЙ ПОХОД»

Картина создана совместно американскими и германскими кинематографистами. Ее поставили режиссеры Х.Нойхойзер и К.Кнезель.

Во время свадьбы Роджера с прекрасной леди Катериной в зал врывается запыхавшийся вестник, сообщающий о захвате Иерусалима сарацинами. Рыцари собираются в поход, когда вдруг на землю спускается межпланетный корабль с невзрачными синенькими пришельцами, которые оказываются весьма агрессивными...

Главных героев играют Д.Райс-Дейвис, Р.Овертон, М.де Барр.

«СОЕДИНЕННЫЕ ОГНЕМ»

Также производство США. Режиссеры-постановщики — Р. Сонен и Р.А.Алберт.

Профессия полицейского никогда не отличалась особым спокойствием и размеренностью жизни. И уж совсем не до спокойствия, когда имеет место целая цепь преступлений, случившаяся за сравнительно короткий период. В дело включаются «волки» своего дела — частный детектив из Нового Орлеана и известный голливудский полицейский в союзе с очаровательной Вики. Им предстоит приложить немало усилий для того, чтобы найти конец запутанного клубка.

В главных ролях заняты Антони Эдвардс, Ланс Хенриксен, Бетси Рассел.

«СЕКРЕТ ДЬЯВОЛА»

И этот фильм снят в США. Его поставил по своему сценарию режиссер Дон Гронкуист.

США, город Портленд. Старик-эмигрант перед смертью передает своему соседу Джеффри Коннорсу карту неизвестной местности и криптограммы с набором букв немецкого алфавита. Такое начало заставляет вспомнить старинные приключенческие романы с тайнами, кладами и зашифрованными письмами. Но секрет, который предстоит раскрыть героям фильма, связан с одной из неразгаданных тайн второй мировой войны, а старик, как выяснится позже, несколько десятилетий назад был видным немецким ученым и заметной фигурой в нацистской партии.

В главных ролях — Дэнни Перкин и Гэтэрин Марбет.

НА СНИМКЕ: кадр из фильма «Дочь командира».

Наша афиша

■ НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ (тэл. 27-42-02). 28 чэрвеня — «Памінальная малітва». Р.Горын (19.00).

■ ТЭАТР-СТУДЫЯ КІНААКЦЁРА (пр.Машэрава, 13, тэл. 23-08-71). 27 чэрвеня — «Мы ідзём глядзець Чапаева» (19.00). 28, 29 чэрвеня — «Міленькі ты мой» (19.00). 30 чэрвеня — «Айседора. Танец кахання» (19.00).

■ БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІЯ, КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛА (пр.Ф.Скарыны, 50). 27-28 чэрвеня — артысты маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра (ММАТ). А.Галін. «Рэтра» (камедыя ў 2-х частках). Ролі выконваюць: Г.Качкажараў, А.Навумкіна, М.Басаў, К.Растоўцава, Л.Стрыжэнава, І.Яфрэмава, М.Дабравольская. Рэжысёр-пастаноўшчык — Г.Яловіч, мастак — В.Салава, кампазітар — А.Марчанка.

Частные объявления

ПРОДАЮ

Гербалайф (дешево). Т. 629-487.

Тушенку гов. 0,5 л, шкуры КРС, котел Е1/9. Т. 566-651.

Мойки кухонные н/ж. Т. 323-418.

Обруч. кольца. Т. 368-737.

Сахар. Т. 638-358.

Пишущие видеоплейеры — 160$, TV «SAMSUNG» 51 см — 290$. Т. 439-432, 328-226, 411-261.

Сжигатель жира. Т. 612-601.

Бензопилу, дрель. Т. 532-643.

Коттедж в Ратомке. Т. 555-055.

Квартиру. Т. 335-016.

П/к жен. из горного козла, кор. р. 44-46 — 200$. Т. 264-819.

КУПЛЮ

Гараж капитальн. Т. 272-812.

1-комн. кв. (р-н Чижовка, Шабаны, Ангарская). Т. 404-615.

Грузовые колеса. Т. 642-071 (с 18), 650-461.

Лекарства. Т. 258-746.

Золотые изд. б/у. Т. 350-913.

Реле: РЭС-9, 10, 22. Т. 503-030.

Старые фотоапп. Т. 583-104.

Молоко сухое обезжиренное. Тел./факс 543-932.

Шины МАЗ, ЗИЛ, ГАЗ. Т. 608-884.

СНИМУ

2-комн. кв. с тел. Т. 234-198.

УСЛУГИ

***Дост. закусок. Т. 331-834.

+++Дост. закусок. Т. 337-073.

Грузоперевозки 10-25 т. Рефрижератор. Т. 634-536, 628-221.

Ремонт ТВ. ДУ, ДМВ, PAI, TXT, дешифратор, НЧ-вход. Т. 214-130.

ПРИГЛАШАЕМ

Секретаря-референта. Т. 334-270, 335-016.

Вы хотите заработать? Вы инициативны, общительны, полны сил и энергии? Вам от 18 до 28? Тогда эта работа для Вас (не гербалайф)! Т. 664-810, 669-561.

Отдых на Черном море, лечение в Трускавце. Т. 290-659.

Дешевый отдых — Пружанская пуща, Чехия; визы — Германия; шоп-тур — Стамбул (7 дн.) — 150$. Т. 693-013.

КОНСУЛЬТАЦИИ

Математика, физика, подготовка к экзаменам. Т. 470-349.

РАЗНОЕ

Выполняем кровельные и гидроизоляционные работы. Сроки короткие, качество высокое. Реализуем подстанцию трансформаторную КТП 100 (дешево), подмости шарнирные, битум. Т. 603-738.

Сообщаем о закрытии ПКФ «РОМЭКС».

Визы ФРГ, туры. Т. 439-664.

МП «Друза» ликвидируется. Претензии принимаются в течение двух месяцев.

Утерянное удостоверение СМ NG 1005 на имя Левшина Вячеслава Николаевича считать недействительным.

Дам ссуду под залог. Т. 239-055 (с 11 до 18).

КІНО-ЦЭНЫ

КІНО Ў МІНСКУ «КУСАЕЦЦА»

Двайная нагрузка лягла на кашалькі нешматлікіх аматараў мінскіх кінатэатраў. Згодна з рашэннем Камітэта па цэнах пры Мінгарвыканкаме, кошт білетаў на кіна- і відэасеансы павялічыўся ў сярэднім у два разы. Цяпер, каб паглядзець аднасерыйны фільм у кінатэатры вышэйшага разраду, трэба выкласці ад 5 да 7 тысяч рублёў, за дзве серыі — 10 тысяч. У першаразрадных цэны крыху ніжэйшыя — ад 3 да 6 тысяч рублёў. А самымі таннымі кінатэатрамі засталіся «Ударнік» і «Сцяг», дзе самы дарагі білет каштуе 3 тысячы, а самы танны — паўтары.

Па асобнай цане ідуць індыйскія фільмы — усе па 4 тысячы. Дзіцячы білет каштуе цяпер 400 рублёў, а дарослы на дзіцячы сеанс — паўтары тысячы. Пасля рамонту пачынае свае стэрэапаказы кінатэатр «Мір». Магчымасць паглядзець на вялікі экран праз спецыяльныя акуляры будзе каштаваць 5 тысяч рублёў. Відэапрагляды ацэнены ў 2-3 тысячы, у індывідуальных кабінах — ад 12 да 16 тысяч.

Разам з тым кінатэатры абавязаны праводзіць раз у тыдзень ільготныя сеансы з фільмамі з асноўнага рэпертуару. Білет на такія сеансы будзе каштаваць у два разы танней за звычайны. Такая ж скідка прадугледжана пры пракаце старых фільмаў і кінастужак паніжанага попыту. За заказ білета па тэлефоне трэба дадаткова заплаціць 300 рублёў.

Віктар КУКЛОЎ, БЕЛІНФАРМ.

На киноэкранах

27 июня

«МОСКВА»: «Соединенные огнем»** — 13.30, 17.30. «Привет, малышка!» — 15.30, 21.30. «Коктейль» (Т.Круз в гл. роли) — 19.30. Шоу «Парадиз», конкурс ди-джеев «Мастер Микс-95» — 23.00.

«ОКТЯБРЬ»: «Кика»*** — 15.20, 19.00. «Красное дерево Африки»*** — 17.20. «СекСказка»*** — 21.00. Муз.-развлек. прогр. «Макс-шоу» — 21.30.

«АВРОРА»: «Звездные войны» (д) — 11.00, 14.40. «Мужчина легкого поведения» — 13.30. «Тяжелая цель»*** — 16.40 (л), 18.40, 20.40.

«БЕРЕСТЬЕ»: «Горячие головы» — 12.20, 15.30. «Смертельный снег»** — 13.50, 18.30. «Камилла»**** — 17.00, 20.10, 21.40.

«ВИЛЬНЮС»: «Джек-попрыгун» — 14.10. «Смертельный танец»*** — 17.30. «Молодая леди Чаттерлей»-2**** — 16.00, 19.00, 20.30, 22.00 (н). Инф.-развлек. прогр. «Улыбка» — 20.30.

«ДРУЖБА»: «Действуй, сестра!» (В.Голдберг в комедии) — 15.30 (л), 19.00. «Плоды страсти»**** — 17.30, 21.00.

«ПАРТИЗАН»: «Московские каникулы» — 15.30, 17.00, 20.00, 21.30. «Я свободен, я ничей» — 18.30.

«ПОБЕДА»: «Смертельный снег»** — 14.40. «Охота за Золотым скорпионом» — 13.00, 16.10, 18.00, 19.40.

«САЛЮТ»: «Приключения Травки» (д) — 10.00. «Волшебная миля» — 13.00, 16.40, 18.20. «Привидение»** — 14.30.

«СОВРЕМЕННИК»: «На златом крыльце сидели» (д) — 11.00. «Кикс»** — 14.30. «Дельта Венеры»**** — 16.30, 18.10, 19.40, 21.10.

«БЕЛАРУСЬ»: «Стрелец неприкаянный» — 13.00, 16.30, 19.00. «Незаконное вторжение»*** — 14.40, 18.10, 20.30.

«КИЕВ»: «История о принцессе-пастушке и ее верном коне Фалладе» (д) — 13.50. «Призрак в компьютере»*** — 15.20, 17.10. «Империя чувств»*** — 19.00, 20.50.

«КОМСОМОЛЕЦ»: «Полет навигатора» (д) — 11.00. «Гениальная идея»** — 15.00, 20.40. «Некуда больше бежать» — 17.00. «Телохранитель» (2с.) — 12.00, 16.00, 20.30. «Гамбургская тусовка» — 14.00, 19.00. Зал индийского фильма: «Любовь выигрывает» (2с.) — 18.20.

«МИР»: «Телохранитель» (2с., К.Костнер и У.Хьюстон в гл. ролях) — 13.00, 19.00. «Экс-терминаторы 3000 года» — 11.30, 17.30, 21.10. «Неизвестный в доме» — 15.30. Стереофильм: «Сокровища четырех корон» — 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00. Видеозал: «Пассажир 57» (боевик) — 13.30, 15.30, 17.30.

«ПИОНЕР»: «Ну, погоди!» (д) — 10.30. «Робот Джокс» (д) — 11.50. «Дар — владыка зверей» — 13.30, 15.30. «Трам-тарарам, или Бухты-барахты» — 17.30, 19.10.

«РАКЕТА»: «Принц из Нью-Йорка» — 18.40. «Безумные ночи Клеопатры»**** — 17.00, 20.30.

«РОДИНА»: «Странная семейка Флоддер»*** (комедия) — 18.00, 21.00. «Танго»*** — 16.30, 19.30.

На телеэкранах

27 июня

Белорусское ТВ

7.35 Утренний коктейль.
7.50 Зеркало Си-эн-эн.
8.05 Студия "Политика".
8.20 День столетия.
8.25 Финансовое время.
8.40 Туробъектив. Путешествия, встречи, отдых.
9.00 Протокол.
9.15 "Сенсация". Худ. фильм.
10.10 Авто-парк.
10.25 "Все мы родом из детства". II Всебелорусский телефестиваль юных талантов. Витебская область. Часть 1-я.
11.55 "Нов и К"-топ.
15.00 Новости.
15.10 "Время выбрало нас". Худ. фильм. 2-я серия.
16.25 "Поздравляем с юбилеем". Вокальная студия г.Могилева.
16.55 "Кайстра". "Песня моя Полесье". Видеоочерк.
17.30 Уроки Н.Новожиловой.
18.00 АТН, Би-би-си, Си-эн-эн.
18.45 "Темная комната". Медицина под маской.
19.20 К 50-летию окончания второй мировой войны. Пресс-импреза. Три вечера со студией "Артэ" (ФРГ).
20.05 "Лада ОМС" представляет: "Моя любовь, моя печаль". Телесериал.
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.35 Скрижали. Артур Шопенгауэр.
21.40 Клип-концерт.
21.50 Реклама.
22.00 "Сенсация". Худ. фильм.
23.00 Новости.
23.15 Экономикст.
23.25 "Музыка без границ". Класс профессора В.П.Скороходова.
0.05 Под куполом Вселенной.

I канал

16.05 "Элен и ребята". Молодежный телесериал.
16.30 Джем.
17.00, 20.00 Время.
17.20 "Тропиканка". Телесериал.
18.10 Час пик.
18.35 "Угадай мелодию". Телеигра.
19.05 Тема.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.40 Из первых рук.
20.55 Баскетбол. Чемпионат Европы. Мужчины. Сборная России - сборная Испании. В перерыве (21.35) - Версии.
22.35 Хит-парад Останкино.
23.20 Новости.

Канал "Россия"

16.00, 19.00, 22.00 Вести.
16.20 Новая линия.
16.50 Будни.
17.20 Никто не забыт.
17.25 Наш сад.
17.55 Непопулярная тема.
18.10 L- клуб.
19.25 Подробности.
19.35 "Актриса". Худ.фильм.
21.15 Хоккей. Кубок Стэнли. Финал. 1-й период.
22.30 Река времени.
22.35 Автомиг.
22.40 Хоккей. Кубок Стэнли. Финал. 2-й и 3-й периоды.

Санкт-Петербург

12.00 Стиль жизни.
12.15 "Болеро". Балет на музыку Мориса Равеля.
12.35 "Немецкая волна".
12.55 Телеменю.
13.00 Скорая помощь.
13.30 "Мануэла". Худ.фильм.
14.20 Советы садоводам.
14.30, 18.30, 21.40 Информ ТВ.
14.45 "Интердевочка". Худ.фильм.
17.05 "Золото". Фильм В.Виноградова.
17.35 По всей России.
17.45 Детское ТВ. "Гадая по сплетениям улиц".
17.55 Телеменю.
18.00 Телемагазин.
18.05 Телеблиц.
18.10 Большой фестиваль.
18.45 Спортивные новости.
18.55 "Мануэла". Худ.фильм.
19.45 Телеслужба безопасности.
20.00 "История четырех женщин. Луиза". Худ.фильм. 2-я серия.
21.20 "Ты и я". Музыкальный фильм В.Виноградова.
21.55 Спорт, спорт, спорт...
22.10 Телеменю.
22.15 Парад парадов. Музыкальное шоу.

IV канал

7.30 Мир вашему дому.
7.40, 10.30, 13.30, 16.45 СИВ. Новости.
7.50 Французский язык для детей.
8.05 "Телевизор кота Леопольда", "Клад кота Леопольда", "Прогулка кота Леопольда". Мультфильмы.
8.25 Сокровища земли рязанской.
9.00 "Аисты". Док. фильм.
9.10 Французский язык.
9.40 Франс-ЭКО.
10.10 "...Под сенью дружных муз". И.И.Дмитриев.
12.30 "Иешуа". Док. фильм. 3-я серия.
13.20 "Ай, милая сестрица". Мультфильм.
13.35 Русский национальный музей искусств.
13.55 Новый старый мир.
14.25 "Морской волк". Худ. фильм. 1-я серия.
16.00 "Белый всадник на белом коне". О генерале М.Д.Скобелеве. Часть 2-я.
16.40 Экспресс-дизайн.

НТВ

17.00 Детям. "Оливер Твист". 7-я серия.
17.25 Док. фильм "Вспомним те годы. 1981". 75-я серия.
18.00, 21.00, 23.00 Сегодня.
18.35 Теннис. Уимблдон.
19.25 Мир кино. "Война со свиньям.1" (Аргентина).
21.35 Час сериала. "Княжна Дейзи". 3-я серия.
22.30 Времечко.
23.15 Теннис. Уимблдон.

8-й канал

18.00 Дубль - 2. Художественный фильм "Выбор".
19.30 Ералаш.
19.45 Телесериал "Арбалет".
20.30 Мультфильм У.Диснея "Аладдин".
21.00 Телесериал "Горец".
21.45 Дилижанс.
22.00 Кино России. Художественный фильм "Фуэте".

28 июня

Белорусское ТВ

7.35 Утренний коктейль.
7.50 Экономикст.
8.00 Зеркало Си-эн-эн.
8.15 "Лада ОМС" представляет: "Моя любовь, моя печаль". Телесериал.
8.45 Скрижали. Артур Шопенгауэр.
8.50 "Сенсация". Худ. фильм.
9.45 "Зорная ростань". Телеконкурс молодых артистов эстрады. Финал. Передача 13-я.
10.40 Телеклуб "Гав-гав".
11.05 Тэлесябрына.
11.25 Мультфильмы.
12.00 Видимо-невидимо.
15.00 Новости.
15.10 "Время выбрало нас". Худ. фильм. 3-я серия.
16.20 К 15-летию ансамбля "Неруш". Концерт.
17.10 "Крок". "Пять звезд". Телеигра.
18.00 Футбол. Кубок Беларуси. Финал. "Динамо" (Минск-93) - "Торпедо" (Могилев). В перерыве (18.45) - АТН.
19.50 К 50-летию окончания второй мировой войны. Пресс-импреза. Три вечера со студией "Артэ" (ФРГ).
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.35 Студия "Политика".
21.50 Клип-концерт.
22.00 День столетия.
22.05 Реклама.
22.15 "Сенсация". Худ.фильм.
23.15 Новости.
23.30 Экономикст.
23.40 Столица.
0.10 Под куполом Вселенной.

I канал

16.05 "Элен и ребята". Молодежный телесериал.
16.30 Тин-тоник.
17.00, 20.00 Время.
17.20 "Тропиканка". Телесериал.
18.10 Час пик.
18.35 "Угадай мелодию". Телеигра.
19.05 В поисках утраченного. Зоя Федорова.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.45 Жан Габен в фильме "Садовник из Аржантея" (Франция).
22.15 Версии.
22.35 Новые обыватели.
23.00 Новости.

Канал "Россия"

16.00, 19.00, 22.00 Вести.
16.20 Дальний Восток.
16.55 Футбол. Чемпионат России. "Торпедо" (Москва) - "Динамо" (Москва).
19.25 Подробности.
19.35 "Санта-Барбара". Худ.фильм.
20.30 Домино Михаила Боярского.
21.05 Зал ожидания.
22.30 Река времени.
22.35 Автомиг.
22.40 "Неудобная женщина". Худ. фильм (США). 4-я серия.
23.35 Экран криминальных сообщений.

Санкт-Петербург

12.00 Стиль жизни.
12.15 "Ты и я". Музыкальный фильм.
12.35 "Немецкая волна".
12.55 Телеменю.
13.00 Скорая помощь.
13.30 "Мануэла". Худ.фильм.
14.20 Советы садоводам.
14.30, 18.30, 21.40 Информ ТВ.
14.40 "Оно". Худ.фильм.
16.40 Исторический альманах.
17.10 Детское ТВ. Сказка за сказкой. "Солдатские байки". Часть 2-я.
18.05 Телемагазин.
18.10 Большой фестиваль.
18.45 Спортивные новости.
18.55 "Мануэла". Худ. фильм.
19.45 Телеслужба безопасности.
20.00 "Норвежские мотивы". Док.фильм (Норвегия).
20.30 Блеф-клуб.
21.05 Консерватор.
21.55 Спорт, спорт, спорт...
22.10 Телеменю.
22.15 "Это было у моря". Худ.фильм.

IV канал

7.30 Мир вашему дому.
7.40, 10.30, 13.30, 16.45 СИВ. Новости.
7.50 Сибирь на экране — детям.
8.00 В объективе — Германия.
9.00 Немецкий язык. 1-й и 2-й годы обучения.
9.55 "Дислокация". Док. фильм.
10.05 "Возвращение". Часть 1-я.
12.30 История — учитель жизни. "Свято место". Док. фильм.
13.20 Медицинские новости России.
13.25 "Пою для вас"...
13.35 Стимул. "Жизнь взаймы".
14.05 "Морской волк". Худ. фильм. 2-я серия.
15.15 Оазис.
15.45 "Взгляд из оркестра". Н.С.Голованов.
16.30 Высшая школа.

НТВ

17.00 Детям. "Оливер Твист". 8-я серия.
17.25 Док. фильм "Вспомним те годы. 1981." 76-я серия.
18.00, 21.00, 23.00 Сегодня.
18.35 Теннис. Уимблдон.
19.30 Мир кино. "Я — монстр" (Великобритания).
21.35 Час сериала "Княжна Дейзи". 4-я серия, заключительная (США).
22.30 Времечко.
23.15 Теннис. Уимблдон.
24.15 Кафе Обломов.

ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінскі гарадскі Савет народных дэпутатаў.
Газета выдаецца на рускай і беларускай мовах з лістапада 1990 г.
Выходзіць штодзённа, акрамя суботы і нядзелі.
Індэкс 63931. Тыраж 40000 экз. Падпісана ў свет у 12.10.
Допісы, атрыманыя рэдакцыяй, не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў.
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Заказ N 2172
Газета надрукавана ў друкарні выдавецтва «Беларускі Дом друку». г.Мінск, пр-т Ф.Скарыны, 79.

ДОБРЫ ВЕЧАР — Добрый вечер
Нам. галоўнага рэдактара Ларыса КОКТЫШ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г.Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а (2-гі паверх).
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 68-28-02, бухгалтэрыі — 32-38-94, аддзела рэкламы — 68-29-33, 68-29-74.
АДДЗЕЛАЎ: палітыкі — 68-29-96, эканомікі — 68-28-22, навін — 68-29-98, 68-26-93, адукацыі і навукі, сацыяльных праблем і рэлігіі — 68-29-34, гарадской гаспадаркі — 68-29-35, культуры — 68-27-34, пісьмаў — 68-29-96, фотакарэспандэнта — 68-27-93. ФАКС — 68-29-74.
Рэклама і прыватныя аб'явы прымаюцца ў рэдакцыі газеты.
За дакладнасць інфармацыі ў рэкламе і аб'явах адказнасць нясе заказчык.